№№81–82
(3007–3008)

29 мая—1 чэрвеня 2009 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Народная Воля

На прастор, на шырокі разлог
Выходзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Не забудзьце падпісацца на «Народную Волю» на другую палову 2009 года!

МАСКВА—МІНСК

Пуцін і Лукашэнка зачынілі дзверы

А чыноўнікі тым часам раскрылі страшэнныя тайны

У аўторак з самай раніцы на плошчы Перамогі ў Мінску ўжо пераміналіся з нагі на нагу ваенны аркестр і ганаровая вахта. Даішнікі, энергічна размахваючы сваімі жэзламі, накіроўвалі паток машын прама па праспекце, не дазваляючы звярнуць у бок вуліцы Захарава. Справа ў тым, што ў рэзідэнцыі на Вайсковым завулку, якая актыўна рамантавалася на працягу апошніх месяцаў, у гэты дзень чакалі кіраўніка расійскага ўрада Уладзіміра Пуціна. Чакалі не раней за 12 гадзін, але "спецыяльны рэжым" быў уведзены ў горадзе з самай раніцы.

Сталічная ДАІ яшчэ за суткі да "дня Х" папярэдзіла мінскіх аўтамабілістаў, на якія вуліцы і ў якія часы лепш не соўвацца. Хаця гэтая аб'ява аказалася бессэнсоўнай: былы расійскі прэзідэнт і цяперашні прэм'ер вядомы тым, што ніколі і нікуды не прыязджае своечасова. Калі хто не памятае, дык нагадаем, што ён умудрыўся спазніцца нават на сваю прэзідэнцкую інаугурацыю. *"Можа, гэта і не выпадковасць, а наўмыснасць былога чэкіста. Розныя ж сітуацыі бываюць, і не толькі з хлебам-соллю ды кветкамі сустракаюць людзей такога рангу..."* — разважалі журналісты, якія бавілі час у чаканні Пуціна. А ён па традыцыі спазняўся.

12 гадзін, 12.30, 13.00... Нарэшце, прыблізна ў 13.20—13.30 стала вядома, што самалёт Уладзіміра Пуціна прызямліўся ў мінскім аэрапорце.

З нецярпеннем чакалі расійскага прэм'ера не толькі журналісты. Напэўна, не вельмі ўтульна напярэдадні гэтай сустрэчы адчуваў сябе і кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка: за некалькі дзён да яе ён вельмі эмацыйна абвінаваціў расійскі ўрад (і такім чынам персанальна Уладзіміра Пуціна) у тым, што ён блакуе рашэнні прэзідэнтаў. І справа нават не ў тым, ці справядлівымі былі абвінавачванні Аляксандра Лукашэнкі, больш важна, што Пуцін, кажуць, чалавек злапамятны, крытыкі ў свой адрас, мякка кажучы, не вітае. З другога боку, не будзем забывацца і пра тое, што нават расійскія аналітыкі не могуць разабрацца, у каго з расійскіх кіраўнікоў улады болей — у Мядзведзева альбо ў Пуціна, таму заявы Аляксандр Лукашэнка дазволіў сабе вельмі рызыкоўныя. І пасля іх беларускаму кіраўніку трэба было прасіць у Пуціна грошай — чарговы крэдыт і, як высветлілася пазней, не адзін.

Чакалі Уладзіміра Уладзіміравіча і на Мінскім трактарным заводзе. Акурат перад гэтым візітам стала вядома, што завод вымушаны пераходзіць на чатырохдзённы працоўны тыдзень, бо сталі нашы "дэфіцытныя трактары" колам на пляцоўках прадпрыемства і вакол яго. А ўсё таму, што расійскі ўрад забараніў купляць па дзяржзаказе імпартную тэхніку, іншымі словамі — падтрымліваць чужых вытворцаў за дзяржаўныя грошы, і "пасыпаліся" беларускія прадпрыемствы пасля такога рашэння адно за адным, бо пераважна на расійскі рынак і працавалі. Вельмі вялікія надзеі мелі на МТЗ, што Пуцін да іх завітае і нейкім чынам удасца вырашыць праблемы з продажам тэхнікі. Але ў праграме візіту расійскага прэм'ера ў Мінск МТЗ нават не было. Праграма была кароценькай: сустрэча з Аляксандрам Лукашэнкам, удзел у расійска-беларускіх перамовах у рамках Саўміна Саюзнай дзяржавы, выхад да журналістаў і сумесная заява расійскага і беларускага прэм'ераў для прэсы.

...Уяўляеце, як спартсмены выходзяць на рынг і вітаюць адзін аднаго, хаця ўнутры ў кожнага — злосць і гатоўнасць да схваткі. Менавіта так, можна меркаваць, сустрэліся Пуцін з Лукашэнкам.

Расійскі прэм'ер пачаў з віншаванняў у сувязі з тым, што Мінск абраны месцам правядзення чэмпіянату свету па хакеі ў 2014 годзе. *"Гэта добрая навіна і для Беларусі, і для Расіі",* — сказаў Пуцін. І нагадаў, што ў гэтым жа годзе пройдзе Алімпіяда ў Сочы.

Але Аляксандра Лукашэнку турбавала іншае: *"Ёсць пэўныя праблемы, якія неабходна абмеркаваць і абгаварыць. Перш за ўсё праблемы сусветнага крызісу, якія нас, на жаль, не абмінулі, і з якімі трэба лічыцца".*

Зразумела, сусветны крызіс хвалюе нас толькі ў тым сэнсе, што краіна застаецца без валюты, фактычна напалову скараціўшы знешні гандаль. І ўжо зразумела, што з такімі тэмпамі падзення да чэмпіянату свету мы можам прыйсці без апошніх штаноў...

Пуцін слухаў Аляксандра Лукашэнку з паразуменнем. Цікава, што перад ім ляжалі толькі некалькі лістоў паперы і ручка, а вось Аляксандр Лукашэнка падрыхтаваўся да сустрэчы больш грунтоўна — меў перад сабой цэлую папку нейкіх дакументаў. Але, на жаль, самой "схваткі" журналісты не бачылі — адразу пасля прывітальных слоў усіх выставілі за дзверы. Таму як на самой справе праходзіла размова адзін на адзін, застаецца толькі здагадвацца.

Пакуль Лукашэнка і Пуцін размаўлялі адзін на адзін, журналісты распытвалі членаў дэлегацый па самых розных пытаннях. Адразу ж высветлілася, што пагадненне аб будаўніцтве Расіяй першай беларускай АЭС у гэты візіт падпісана не будзе, хаця анансаваў гэтае падпісанне кіраўнік "Росатома" Сяргей Кірыенка. *"Толькі ў трэцім квартале дакумент будзе гатовы",* — тлумачыў журналістам у Мінску намеснік Кірыенкі Аляксандр Локшын.

Галоўны фінансіст расійскага ўрада, віцэ-прэм'ер Аляксей Кудрын, у сваю чаргу даваў зразумець, што не ўсё так проста і з выдзяленнем нашай краіне крэдыту ў 500 мільёнаў долараў, хаця дакументы на гэты конт падпісаны даўно, а грошы на крэдыт нават закладзены ў расійскім бюджэце. *"Мы можам сутыкнуцца з неплацежаздольнасцю беларускага ўрада і ў цэлым эканомікі ў сувязі з недастатковасцю золатавалютных рэзерваў Беларусі, магчыма, нават у канцы гэтага года, а можа, праз год",* — падобна на тое, што прадстаўнікі Расіі ведаюць пра глыбіню нашага крызісу значна больш, чым мы тут, у Беларусі. *"Урад Беларусі прымае недастатковыя меры, каб забяспечыць сваю стабільнасць і плацежаздольнасць эканомікі",* — канстатаваў Кудрын. Фактычна Аляксей Кудрын прадказаў Беларусі дэфолт. І выдаў страшэнную тайну, што Беларусь просіць у Расіі крэдыт на будаўніцтва атамнай станцыі ў памеры... 9 мільярдаў долараў. Атрымоўваецца, што беларусам проста тлумілі галаву, агітуючы за АЭС, нас проста падманвалі наконт таго, колькі яна будзе каштаваць.

Так, у 2006 годзе, на славутай нарадзе па энергетычнай бяспецы, на якой і было прынята рашэнне будаваць АЭС, кіраўнік Акадэміі навук Беларусі Міхаіл Мясніковіч сцвярджаў: *"Кошт будаўніцтва двух энергаблокаў складзе прыкладна 3—3,5 мільярда долараў. Гэта не завоблачная, а зусім рэальная сума".*

Пра тое, што будаўніцтва АЭС будзе каштаваць 3—4 мільярды долараў, не адзін раз казалі і прадстаўнікі Міністэрства энергетыкі. І раптам — толькі ў Расіі мы хочам пазычыць на будаўніцтва АЭС дзевяць мільярдаў!..

Карацей, скарыстаўшыся паўзай, беларускія журналісты даведаліся шмат цікавага: расійскія ж чыноўнікі БТ не глядзяць і, напэўна, нават не ведалі, што рассакрэцілі інфармацыю *"не для агульнага карыстання"* — і пра сапраўдную *"атамную бухгалтэрыю",* і пра сапраўдны стан беларускай эканомікі.

На жаль, на момант здачы гэтага матэрыяла сустрэча Уладзіміра Пуціна і Сяргея Сідорскага нават не пачыналася. Таму пра вынікі саюзнага Саўміна мы раскажам у наступным нумары. Калі, зразумела, яны будуць. Бо няцяжка здагадацца, што самыя галоўныя пытанні Пуцін і Лукашэнка вырашалі адзін на адзін. Але з-за зачыненых дзвярэй прэзідэнцкага кабінета ніякія добрыя навіны не прасачыліся. Відавочна, аднак, што толькі за адны абяцанні Расія плаціць нашай краіне ўжо не будзе. Часы такія, што ўсе ў першую чаргу лічаць грошы — і мы, і нашы партнёры.

Алена НОВІКАВА.

СУД!

Мікалаю Кудзелку — 9 гадоў турмы, Ігару Крапчуку — 6 гадоў

Мінскі гарадскі суд асудзіў былога намесніка начальніка камітэта па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі **Мікалая КУДЗЕЛКУ** да 9 гадоў пазбаўлення волі з адбыццём пакарання ў калоніі ўзмоцненага рэжыму, паведамляе "Інтэрфакс". Акрамя гэтага, суд пазбавіў М.Кудзелку звання палкоўніка, прызначыў канфіскацыю маёмасці, забараніў займаць пасады ў праваахоўных органах на 3 гады. Суд прызнаў яго вінаватым у атрыманні хабараў, злоўжыванні службовым становішчам і незаконным набыцці боепрыпасаў.

Акрамя гэтага, суд прызначыў 6 гадоў пазбаўлення волі экс-дырэктару "Эмір-Мотарс" **Ігару КРАПЧУКУ** таксама з адбыццём у калоніі ўзмоцненага рэжыму, з канфіскацыяй маёмасці і забаронай займаць кіруючыя пасады на прадпрыемствах усіх форм уласнасці на 3 гады. Ён прызнаны вінаватым у даванні хабараў і махлярстве.

Нагадаем, што экс-дырэктар "Эмір-Мотарс" (прадпрыемства-імпарцёр аўтамабіляў "Таёта" ў Беларусь) І.Крапчук у жніўні 2008 года быў асуджаны да 5 гадоў пазбаўлення волі за ўвоз больш чым 300 аўтамабіляў "Таёта" без выплаты мытных пошлін. Па гэтай справе яму прад'яўленае абвінавачванне ў даванні хабараў М.Кудзелку.

Былому намесніку начальніка КБАЗіК было прад'яўлена абвінавачванне ў атрыманні хабараў ад камерсантаў на суму больш як 800 тысяч долараў. Раней таксама паведамлялася, што М.Кудзелка праходзіў па гучнай справе "трох палкоўнікаў". У жніўні 2008 года Ваенная калегія Вярхоўнага суда асудзіла да доўгіх тэрмінаў зняволення двух палкоўнікаў КДБ — былога начальніка ўпраўлення па барацьбе з аргзлачыннасцю і карупцыяй КДБ **Міхаіла Міхалапа** і начальніка кадравай і ідэалагічнай работы КДБ **Аляксандра Мяцеліцу** за атрыманне хабараў і махлярства. Падчас папярэдняга расследавання крымінальная справа ў дачыненні да М.Кудзелкі была вылучана ў асобную вытворчасць. Паводле матэрыялаў крымінальнай справы, М.Кудзелка падазраецца ў тым, што атрымаў першы хабар у пачатку 90-х гадоў мінулага стагоддзя. У 2003 годзе ён сышоў з праваахоўных органаў на пенсію і ўладкаваўся працаваць у камерцыйную структуру на пасаду намесніка дырэктара — начальніка службы бяспекі аўтасалона "Таёта-цэнтр".

ЧУЛІ?

Моладзь выбрала... пенсіянера

28 маладзёжных лідэраў з розных палітычных партый і грамадскіх арганізацый прынялі маніфест. Тэкст дакумента рэзкі, лаканічны. Але...

"Мы, прадстаўнікі новага пакалення грамадскіх і палітычных лідэраў, — гаворыцца ў дакуменце, — адчуваем сваю адказнасць за лёс Беларусі, яднаемся дзеля дасягнення рэальных перамен у нашай краіне і заяўляем:

— высілкі папярэдніх генерацый беларускіх палітыкаў і грамадскіх дзеячаў прывялі да ўмацавання палітычнай незалежнасці краіны, але не цалкам вырашылі задачы яе нацыянальнага і духоўнага адраджэння, гаспадарчага дабрабыту, пабудовы дзяржавы права, годнага развіцця беларускай культуры і навукі;

— крызіс палітычнай і эканамічнай мадэлі беларускай дзяржавы і новыя геапалітычныя выклікі рубам ставяць перад нашай Бацькаўшчынай пытанне выбару шляху далейшага развіцця;

— у сённяшняй сітуацыі Беларусі неабходна далучацца да працэсаў еўрапейскай інтэграцыі ды рэфармаваць гаспадарчы і палітыка-прававы лад у адпаведнасці з крытэрыямі сяброўства ў Еўрапейскім Саюзе;

— рух Беларусі ў еўрапейскую сям'ю вольных нацый магчымы толькі праз вяртанне нашага грамадства да еўрапейскіх каштоўнасцяў, у першую чаргу — хрысціянскіх і дэмакратычных, такіх як свабода, справядлівасць, сумленнасць, любоў да свайго народа, мовы і культуры;

— для нас быць беларусам — значыць быць еўрапейцам..."

Моладзь узяла на сябе адказнасць за лёс краіны, назвала сябе новай генерацыяй у палітыцы і на першы погляд рашуча настроена выправіць памылкі папярэднікаў. Але ёсць у тэксце дакумента пункт, які тлумачыць і мэты, і саму ініцыятыву прыняцця дакумента з гучнай назвай "маніфест". І пункт такі: "Падтрымліваем дзеянні лідэра Руху "За Свабоду" Аляксандра Мілінкевіча..."

Фактычна маладзёжныя лідэры падчас прэс-канферэнцыі і не хавалі, што іх ініцыятывы скіраваны "пад Мілінкевіча" — немаладога ўжо чалавека, якому гэтым летам будзе 62 гады. Такім чынам, у "новага пакалення палітыкаў" аказаўся знаёмы і немалады твар.

Хто ж падпісаўся пад дакументам?

Па большасці тыя, хто і раней працаваў у Аляксандра Мілінкевіча, альбо ў структурах, якія даўно з ім супрацоўнічаюць. Сярод падпісантаў Павел Севярынец, Юрась Губарэвіч, Алесь Міхалевіч, Зміцер Дашкевіч, Артур Фінькевіч, Алесь Лагвінец, Наста Палажанка, Сяргей Салаш, Алесь Зарэмбюк, Аляксей Шэін, Ігар Лялькоў і іншыя. Навошта спатрэбілася чарговая дэманстрацыя вернасці — незразумела.

Навошта выдаваць добра вядомае старое за рэвалюцыйнае і новае, таксама можна толькі здагадвацца.

Нагадаем, аднак, са свайго боку, што моладзь ужо аднойчы брала на сябе адказнасць за лёс краіны. Гэта таксама было гучна і пафасна — у 2006 годзе, падчас прэзідэнцкіх выбараў, на якіх у прэзідэнты балатаваўся ўсё той жа Аляксандр Мілінкевіч. Вынік — вядомы: кандыдат публічна прызнаў сваю паразу ад Аляксандра Лукашэнкі. Сітуацыя паўтараецца?

Ігар МАРОЗАЎ.

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Бронислав СИВЫЙ: «Я и теперь неплохо зарабатываю...»

Пару лет назад тогда еще руководитель концерна "Белнефтехим" Бронислав Сивый возглавлял рейтинг самых высокооплачиваемых чиновников. В прессе отмечали, что по размеру своего официального оклада Бронислав Петрович обошел председателя Госконтроля, генерального прокурора и еще с десяток других министров.

— Я и теперь неплохо зарабатываю, — признался Бронислав Петрович, отвечая на вопрос "Народной Воли" о своем сегодняшнем заработке. — Но сколько — не скажу. Потому что завтра пришлют комиссию, начнут разбираться, почему большая зарплата. Вопрос же не в этом заключается. Я до назначения на должность заместителя исполнял обязанности и заместителя, и свои *(до недавнего времени Сивый возглавлял главное инвестиционное управление "Белнефтехима")*, соответственно, получал немного больше.

— В апреле этого года вас назначили зампредседателя концерна. Долго раздумывали, когда вам снова предложили занять руководящий пост?

— Я никогда не раздумываю. Мне предлагают — я соглашаюсь.

— После вашего ухода с поста председателя "Белнефтехима" ходили самые разные разговоры... В прессе проходила информация, что вы после новополоцкого "Стекловолокна" якобы не сумели *"вписаться в наполненную интригами и большими связями столичную жизнь"*...

— Мне глава государства букет цветов дал, когда я уходил с этой должности...

— Значит, никаких закулисных штук в вашем уходе не было?

— Я просто к этой работе был не готов. Я ведь всю жизнь работал главным инженером. И до сих пор, по сути, остался главным инженером, ну, так сказать, совмещая должности. А работа председателя концерна "Белнефтехим" — это политическая должность, а я — технарь...

Марина КОКТЫШ.

ПО СЛУХАМ И...

Боровский вернулся в «Белнефтехим»?

После Бронислава Сивого концерном "Белнефтехим" руководил Александр Боровский. Правда, недолго — в мае 2007 года Боровский был арестован за злоупотребление служебными полномочиями, а в марте 2008 года приговорен к 5 годам тюрьмы. В конце декабря минувшего года А.Лукашенко помиловал Боровского, и он вышел на свободу.

Недавно в определенных кругах прошел слух о том, что Боровский будто бы вернулся в концерн на одну из рядовых должностей.

"Это неправда", — сказала "Народной Воле" одна из дочерей Александра Васильевича, не уточнив при этом, работает ли где-то сейчас ее отец.

Зварот

VII з'езда ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" да прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Сідорскага Сяргея Сяргеевіча

Паважаны Сяргей Сяргеевіч!

VII з'езд ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" звяртаецца да Вас у сувязі з эканамічнай дыскрымінацыяй недзяржаўных грамадска-палітычных выданняў, якая асабліва выразна праяўляецца ў сферы іх распаўсюджвання.

З канца 2005 года паўтара дзесятка недзяржаўных грамадска-палітычных СМІ выключаныя з дзяржаўнай сеткі распаўсюджвання па падпісцы, якую ажыццяўляе РУП "Белпошта". Шматлікія звароты да абласных філіялаў і ў РУП "Белпошта", Міністэрства сувязі і інфарматызацыі (у сістэму якога "Белпошта" ўваходзіць), ні да чаго не прывялі. Іскі рэдакцый і чытачоў газет беларускія суды адмовіліся разглядаць.

Аналагічным чынам сітуацыя складваецца і з продажам газет прадпрыемствамі "Саюздруку". Больш за дзесяць беларускіх недзяржаўных грамадска-палітычных выданняў з розных нагод не прадаюць праз раздробную сетку прадпрыемстваў "Саюздруку", у той час як не толькі дзяржаўныя, але і выключна забаўляльныя выданні знаходзяць сваё месца на вітрынах кіёскаў.

У канцы 2008 года ў дзяржаўныя сеткі распаўсюджвання вярнулі газеты "Народная Воля" і "Наша Ніва". Дэлегаты VII з'езда ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" вітаюць гэты крок, аднак звяртаюць увагу, што 13 недзяржаўных СМІ па-ранейшаму не могуць распаўсюджвацца праз сістэмы "Саюздруку" і "Белпошты".

Адмовы на распаўсюджванне недзяржаўных газет, як правіла, тлумачаць эканамічнымі прычынамі. Аднак шмат якія з выданняў, што выключаныя з падпісных каталогаў і не прадаюцца ў кіёсках "Саюздруку", уваходзілі ў лік лідэраў продажу ў сваіх рэгіёнах. Адмова прадпрыемстваў "Белпошта" і "Саюздрук" ад рэальных грошай ва ўмовах эканамічнага крызісу выклікае неразуменне, як і спроба спаслацца на свабоду суб'ектаў гаспадарання ў заключэнні дамоў.

Тое, што адбываецца, прыводзіць да высновы пра свядомую эканамічную і прававую дыскрымінацыю недзяржаўнай грамадска-палітычнай прэсы і замах на грамадзянскія і палітычныя правы і свабоды грамадзян, у тым ліку на свабоду выказвання меркавання, права шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю (арт.19 Міжнароднага пакту аб грамадзянскіх і палітычных правах). Такія абмежаванні не грунтуюцца на законе і не могуць быць прызнаныя ў дэмакратычным грамадстве.

Забяспечыць роўныя правы ўсім СМІ шляхам зняцця забароны на распаўсюджванне незалежных друкаваных мас-медыя праз дзяржаўныя сеткі распаўсюджвання — "Саюздрук" і "Белпошта" — заклікаў у сваёй рэзалюцыі ад 2 красавіка Еўрапейскі парламент. Ён назваў гэта адным з накірункаў, прагрэс па якіх можа стаць індыкатарам змен да лепшага. Лічым неабходным, каб ва ўмовах распачатага перамоўнага працэсу паміж Беларуссю і Еўрасаюзам гэты зварот быў пачуты ўрадам Рэспублікі Беларусь, міністэрствамі і ведамствамі.

VII з'езд ГА "Беларуская асацыяцыя журналістаў" заклікае Вас вярнуць сітуацыю ў прававое поле, дамагчыся спынення прававой і эканамічнай дыскрымінацыі недзяржаўных грамадска-палітычных выданняў і забяспечыць рэалізацыю канстытуцыйных правоў грамадзян Рэспублікі Беларусь на атрыманне і распаўсюджванне інфармацыі і выказванне свайго меркавання.

SOS!

За кратамі Аўтуховіч згубіў каля 20 кілаграмаў

Пра гэта "Народнай Волі" паведаміў праваабаронца Алег Волчак.

"Чацвёрты месяц Аўтуховіч, Асіпенка і Лявонаў знаходзяцца пад вартай", — нагадвае Волчак. — Па тых абвінавачаннях, па якіх іх арыштавалі, што быццам бы ўдзельнічалі ў падпалах дамоў начальніка міліцыі і падатковага інспектара — ніякіх следчых дзеянняў дагэтуль не праводзіцца. Не выключаю, што спецслужбы наўмысна цягнуць час. Між тым сёння ці заўтра ў пракуратуры будзе вырашацца, ці працягнуць тэрмін расследавання па справе Мікалая Аўтуховіча і ягоных калег".

Нагадаем, што патрабуючы хутчэйшага расследавання справы яшчэ 16 красавіка Мікалай Аўтуховіч абвясціў бестэрміновую галадоўку. У мінулым нумары "Народная Воля" паведамляла аб тым, што прадпрымальнік знаходзіцца пад кропельніцай. З ягонай згоды яму ўводзяць глюкозу: "Калі Мікалай знаходзіўся ў турэмным шпіталі, медыкі ацанілі стан здароўя Аўтуховіча і адправілі назад у санчасць ізалятара", — распавядае Волчак. — З пачатку галадоўкі прайшло ўжо больш як сорак дзён. За гэты час ён згубіў каля 20 кілаграмаў вагі. Умовы для правядзення галадоўкі за кратамі, мякка кажучы, не зусім спрыяльныя. Ды і якасць вады, якую п'е ў ізалятары Аўтуховіч, не самая лепшая. Тым не менш прыпыняць галадоўку Мікалай Аўтуховіч не збіраецца".

Як паведаміў Алег Волчак, Мікалай Аўтуховіч наракае на тое, што апошнім часам яму сталі менш пісаць: "Ён скардзіцца на тое, што атрымлівае зусім мала лістоў. У яго стане — падтрымка з волі — бадай самае важнае..."

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Даслаць ліст Мікалаю Аўтуховічу можна па адрасе:
220030, Мінск, Валадарскага, 2, СІЗА №1 Мікалаю Аўтуховічу.

АКТУАЛЬНА

Ці стрымае Міністэрства аховы здароўя цэны на лекі?

Сёння ў галоўным медыцынскім ведамстве чакаюць прадстаўнікоў айчынных і замежных фармацэўтычных кампаній на падпісанне мемарандуму па стрымліванні цэн на лекі.

Апошнім часам асноўны галаўны боль Міністэрства аховы здароўя — цэны на лекі: як іх стрымаць і якія прадпрыняць захады, каб мікстуры і таблеткі не сталі для большасці беларусаў недаступным таварам? Зараз міністэрства прапануе вытворцам лекаў падпісаць мемарандум. Ад фармакампаній ведамства чакае мараторыя на цэны на лекі на 2009 год. Са свайго боку абяцае дасягнуць дамоўленасцяў з мытным камітэтам і Міністэрствам эканомікі аб адмене мытных пошлін на ўвозімыя лекі на тэрыторыю Беларусі. А для медыкаментаў расійскай вытворчасці яшчэ і адмены падатку на дабаўленую вартасць.

Ці прымуць такія правілы працы ў першую чаргу замежныя кампаніі? Калі страты айчынных фармазаводаў можа кампенсаваць дзяржава, то замежныя кампаніі працуюць цалкам у рынычных умовах і не будуць прадаваць лекі беларускім спажыўцам сабе ва ўрон. Ды і Беларусь не такая вялікая дзяржава, як, напрыклад Расія і Украіна, каб за яе рынак трымацца. Таму некаторыя аналітыкі і кажуць, што такі мемарандум можа прывесці да дэфіцыту імпартных лекаў.

— Цяжка сказаць, падпішуць кампаніі мемарандум ці не, — кажа намеснік дырэктара Асацыяцыі міжнародных фармацэўтычных вытворцаў **Віктар Люковіч**. *— Яны самі прымаюць рашэнне, ні Міністэрства аховы, ні Асацыяцыя не могуць на іх ціснуць. Магчыма, хтосьці падпіша, а хтосьці— не. Ёсць групы імпартных лекавых сродкаў, якія нельга замяніць беларускімі аналагамі, але і знізіць цану на іх немагчыма. Тады рэгуляванне цэн і павінна адбывацца за кошт адмены мытных пошлін, што, між іншым, і прапаноўваецца. Расія таксама на час крызісу адмяніла мытныя пошліны для ўвозімых лекаў. Думаю, што дэфіцыту замежных лекаў не ўзнікне.*

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

Народная воля
http://www.nv-online.info
29 МАЯ–1 ЧЭРВЕНЯ 2009 г.

ГУЧНАЯ ТЭМА

Які лёс напаткаў міліцэйскія катэджы?

У дамы, што знаходзяцца непадалёк ад Заслаўскага вадасховішча і раней належалі міліцэйскім чыноўнікам, дзеці-сіроты пакуль не пераехалі.

Былыя суседзі міліцэйскіх босаў з цяжкасцю вераць, што гэта здарыцца ў хуткім часе.

"Тут жа амаль няма ніякай інфраструктуры, — — выказваюць свае думкі некаторыя жыхары пасёлка Крынічны. — *Хіба толькі спачатку ўсе гэтыя будынкі разбурыць і пабудаваць нешта новае, спецыяльна прызначанае для дзетак. Альбо, наадварот, дабудаваць недабудаванае. Але ў любым выпадку без укладання дзяржаўных грошай не абыдзецца".*

Як стала вядома "Народнай Волі", свае дамы змаглі выратаваць толькі дзве — былыя намеснікі міністра ўнутраных спраў **Юрый Радзюкевіч** і **Віктар Філістовіч**. Яны разабралі будынкі і перавезлі іх у іншае месца. Астатнія гаспадары проста вывезлі ўсё, што можна было. Многія дамы стаяць без акон і дзвярэй. Побач — акуратна складзеная цэгла, нейкія блокі, пакеты з цэментам. Каму належаць гэтыя будаўнічыя матэрыялы — дакладна невядома.

Варта адзначыць, што катэджы дагэтуль знаходзяцца пад міліцэйскай аховай. Праца ў міліцыянтаў няпыльная — сядзі сабе, птушак слухай ды назірай, хто ходзіць вакол гэтых домікаў...

"Каб не разрабавалі, відаць, паставілі ахову", — кажуць суседзі. — *Але хто сюды сунецца пасля той нарады? Усе ж ведаюць, што тут вакол амаль што адна міліцыя жыве".*

АФІЦЫЙНА

У Мінаблвыканкаме "Народнай Волі" паведамілі, што ўсе распараджэнні прэзідэнта выкананы, і цяпер дамы знаходзяцца ў распараджэнні Мінскага райвыканкама. Усе далейшыя пытанні па іх абслугоўванні і размеркаванні будзе вырашаць менавіта райвыканкам. У райвыканкаме таксама суха запэўнілі, што ўсе прэзідэнцкія даручэнні будуць выкананы, і ў гэтыя дамы абавязкова пераселяць дзяцей-сірот.

ЯК ГЭТА БЫЛО

У лістападзе мінулага года А.Лукашэнка заявіў, што былыя і дзеючыя супрацоўнікі Міністэрства ўнутраных спраў самавольна захапілі злітныя ўчасткі зямлі ў Мінскім раёне. Паводле слоў А.Лукашэнкі, для будаўніцтва яны літаральна за капейкі прыдбалі сабе тэрыторыю былога лецішча дзіцячага садка, якая знаходзілася ў ахоўнай зоне Заслаўскага вадасховішча.

"Дайце ўласнікам тры месяцы, каб яны знеслі свае пабудовы, — аддаў публічны загад Лукашэнка. — *Калі не знясуць, то яны бязвыплатна будуць канфіскаваны пад дамы для дзяцей-сірот. Выконвайце!"*

"Народная Воля" друкавала дакументы, з якіх вынікала, што міністр унутраных спраў генерал Уладзімір Навумаў асабіста хадайнічаў, каб ягоныя падначаленыя атрымалі права на будаўніцтва дамоў на тэрыторыі летняй дачы дзіцячага садка Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі.

Напрыканцы мінулага года Мінскі раённы выканаўчы камітэт падаў іск *"аб прызнанні несапраўджанай дзяржаўнай рэгістрацыі ўзнікнення, пераходу права ўласнасці на зямельныя ўчасткі і размешчаныя на іх капітальныя будынкі"*. Суд прыняў рашэнне не на карысць уладальнікаў маёнткаў — у іх адабралі зямлю. А праз некаторы час міліцэйскія катэджы прынялі ў камунальную ўласнасць як аб'екты завершанага і незавершанага будаўніцтва.

Даша ПАЎЛОЎСКАЯ.

Апазіцыянера адлічылі з універсітэта за графіці «Свабоду Аўтуховічу!»

Актывіста незарэгістраванага "Маладога фронту" **Пятра Рузава** адлічылі з Баранавіцкага дзяржаўнага універсітэта.

12 мая студэнту фінансава-прававога факультэта паказалі адпаведны загад. Дакумент падпісаў рэктар. Фармулёўка — "парушэнне ўнутранага распорадку", паведамляе прэс-служба "Маладога фронту". Раней раашэнне суда Рузава аштрафавалі за тое, што ён нанёс графіці "Свабоду Аўтуховічу!" на будынку гарадзкога мясакамбіната.

"З пачатку года універсітэт неаднаразова наведвалі супрацоўнікі КДБ і міліцыі, якія пагражалі адлічэннем за грамадзкую дзейнасць. Напэўна, суд за графіці стаў апошнай кропляй", — заявіў Пётр Рузаў.

Толькі 10 працэнтаў дзяцей Мінска да 17 гадоў абсалютна здаровыя

Пра гэта паведаміла галоўны педыятр сталіцы **Аксана Някрасава** на прэс-канферэнцыі ў Мінску.

"Стан здароўя дзяцей Мінска не зусім такі, які б хацелася нам бачыць", — сказала яна. 17,3 працэнта дзяцей сталіцы маюць тыя ці іншыя хранічныя захворванні; 72,7 працэнта — маюць другую групу здароўя, што характарызуецца рознымі функцыянальнымі адхіленнямі, якія затым або знікаюць, або пераходзяць у хранічную паталогію.

Анастасія ЯНУШЭЎСКАЯ, БелаПАН.

Лепшыя!

Днямі стала вядома, што па выніках штогадовага апытання, у якім прынялі ўдзел каля 200 чалавек (трэнеры, арбітры, спецыялісты і журналісты), лепшым хакеістам Беларусі сезона — 2008/09 стаў форвард клуба НХЛ "Таронта Мэйпл Ліфс" і зборнай Беларусі **Міхаіл Грабоўскі**.

На другім месцы — варатар магнітагорскага "Металурга" **Андрэй Мезін**, на трэцім — абаронца клуба НХЛ "Каларада Эвеланш" **Руслан Салей**.

"Мне ближэй за ўсё той хакей, які знаходзіцца на сусветнай вяршыні, — распавёў Міхаіл карэспандэнту "Народнай Волі". — А гэта, безумоўна, Нацыянальная хакейная ліга. Пік майстэрства для кожнага хакеіста!"

Алесь СІВЫ.

ВЯРТАЮЧЫСЯ ДА НАДРУКАВАНАГА

Са Станіславам Шушкевічам спрачаецца Аляксандр Каўбаска

У "Народнай Волі" за 19–21 мая быў надрукаваны артыкул экс-старшыні Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь Станіслава Станіслававіча Шушкевіча. На жаль, ён выклікаў нязгоду з боку кіраўніцтва Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта, які з-за рэпрэсій беларускіх улад вось ужо некалькі год працуе ў Вільнюсе. Прэзэктар ЕГУ па акадэмічных справах А.Каўбаска даслаў у рэдакцыю ліст, з якім мы, вядома, азнаёмілі аўтара публікацыі. Таму кожную пазіцыю сп.Каўбаскі даём сёння з каментарыем-адказам сп.Шушкевіча.

А.Каўбаска: — Спадар Шушкевіч не меў НІЯКАГА дачынення да ўзнікнення ЕГУ.

С.Шушкевіч: — Як жа не меў! Калі вырашалася пытанне адкрыцця Еўрапейскага гуманітарнага універсітэта ў Мінску, я спачатку працаваў першым намеснікам старшыні Вярхоўнага Савета, а потым — старшынёй парламента. І як адзін з татачасных кіраўнікоў краіны я актыўна саздзейнічаў станоўчаму вырашэнню пытання. Не без маёй падтрымкі будынак побач з Домам афіцэраў быў перададзены епархіі праваслаўнай царквы, якая ў сваю чаргу прадаставіла яго ў доўгатэрміновую арэнду ЕГУ. Я магу прывесці і іншыя прыклады садзейнічання адкрыццю гэтай навучальнай установы ў Мінску.

А.Каўбаска: — Існуюць жывыя ўдзельнікі нарады амбасадараў заходнееўрапейскіх краін у Вільнюсе, гатовыя аспрэчваць факт іх "замбіравання" сп.А.Міхайлавым.

С.Шушкевіч: — А што, спадар Міхайлаў да нарады не меў ніякіх размоў з тымі ж амбасадарамі? І слова "замбіраванне" ў дачыненні да такіх высокіх асоб, мяркую, не зусім карэктнае.

А.Каўбаска: — Сп.Эдуард Мелнікаў гатовы пацвердзіць, што сцвярджэнне сп.Шушкевіча пра зняцце з тэлеперадачы "Белсата" крытычных выказванняў аб ЕГУ нібыта па просьбе сп.А.Міхайлава, мякка кажучы, не адпавядае рэчаіснасці.

С.Шушкевіч: — Гэты пасаж сапраўды патрабуе ўдакладнення. Сёння спадар Мелнікаў гаворыць, што ён "выразаў" адпаведныя фрагменты, зыходзячы з прафесійных меркаванняў, а не па просьбе А.Міхайлава. Няхай будзе так. Але, скажыце, спадар Каўбаска і спадар Мелнікаў, чаму да сённяшняга дня ніхто не запрашае мяне на дыскусію па пытанні ЕГУ? Я гатовы прыняць у ёй удзел.

А.Каўбаска: — Магчыма, сп.Шушкевіч не захацеў знайсці беларускую версію сайта ЕГУ (htt://bel.ehu.lt), у тым ліку і з **АПОШНІМІ** навінамі, накшталт публічнай лекцыі сп.В.Акудовіча і абмеркавання яго працы "Код адсутнасці", якая адбылася 20.05.09 года.

С.Шушкевіч: — Тут я павінен папрасіць прабачэння. Мабыць, не цалкам выкарыстаў пошукавую сістэму.

А.Каўбаска: — Перш чым сцвярджаць пра *"татальную русіфікацыю"* сённяшніх навучэнцаў ЕГУ, трэба проста пагадзіцца на сустрэчу з імі, на што ў спадара Шушкевіча часу да гэтай пары не знайшлося.

С.Шушкевіч: — Спадар Каўбаска, а Вы альбо спадар Міхайлаў накіроўвалі мне лісты з такой просьбай? Не. Дык пра што Вы гаворыце? Каб я выступіў з лекцыяй у такой установе, як ЕГУ, я павінен мець афіцыйнае запрашэнне, і яно павінна быць ад кіраўніцтва універсітэта, а не ад студэнцкіх суполак.

А.Каўбаска: — Дэпутат Бундэстага ФРГ сп.Маркус Мекель можа падпісацца ў сваім аўтарстве ідэі аб падтрымцы ЕГУ.

С.Шушкевіч: — Няхай падпісваецца. А я бачу праблему так, як я яе бачу.

А.Каўбаска: — Сп.А.Міхайлаў НІКОЛІ не называў беларускую апазіцыю "маргінальнай".

С.Шушкевіч: — Тут я хачу працытаваць цэлы фрагмент са свайго артыкула. Я напісаў: "Нельга паразітаваць на целе той культурнай беларускай дэмакратычнай апазіцыйнай інтэлігенцыі, якой Вы, прафесар Міхайлаў, зняважліва раіце *"попытаться осуществить своеобразную терапию по отношению к тому мышлению, которое имеет место и в рядах белорусской оппозиции"*, таму што ў ёй — у гэтай апазіцыі — *"преобладает дух конфронтации и обличения самих себя, не извлекая уроков прежнего, крайне печального опыта"*.

На вялікі жаль, не магу інакш, як Вашымі словамі, спадар Міхайлаў, са згаданага вышэй артыкула ацаніць перспектывы **вашай асабістай** дзейнасці: *"и если это будет продолжаться, то у Беларуси не будет никакого будущего"*.

Не! Маргінальная дзейнасць, якую Вы, седзячы ва ўтульным Вільнюсе і падарожнічаючы па цывілізаваным замежжы, прыпісваеце збіваемай амаліпаўскімі ботамі і кідаемай у турмы дэмакратычнай апазіцыі ў Беларусі, існуе пераважна ў Вашым уяўленні". Вось у якім кантэксце я пратэстую супраць таго, як спадар Міхайлаў падводзіць дзейнасць беларускай апазіцыі пад маргінальныя крытэрыі...

А.Каўбаска: — Сп.А.Міхайлаў НІКОЛІ не працаваў прадстаўніком БССР пры ААН.

С.Шушкевіч: — Так, трэба ўдакладніць. У інтэрнэтаўскай біяграфіі А.Міхайлава напісана: *"В 1974—1980 годах сотрудник Центра социального развития и гуманитарных дел (Нью-Йорк—Вена)"*. Самі пацікаўцеся, пры якой міжнародай арганізацыі дзейнічаў у той час названы Цэнтр. Я, калі пісаў артыкул, не меў на ўвазе тую пасаду, якую некалі займаў пры ААН вядомы наш паэт і грамадскі дзеяч Генадзь Бураўкін.

АД РЭДАКЦЫІ

Мяркуем, няма сэнсу каментаваць як сцвярджэнні спадара Каўбаскі, так і адказы яму спадара Шушкевіча. Чытачы самі гэта зробяць.

ОФИЦИОЗ

Вице-премьер Андрей Кобяков шьет костюмы на заказ

Судя по всему, вице-премьеру Андрею Кобякову, которого называют долгожителем в белорусском правительстве, не очень нравится продукция, выпускаемая Минским часовым заводом "Луч".

Такой вывод можно сделать из ответов Кобякова на вопросы "Народной Воли", которые были заданы ему во время пресс-конференции о текущей экономической ситуации в Республике Беларусь.

— Андрей Владимирович, в последнее время активно циркулируют разговоры о том, что белорусское правительство вот-вот отправят в отставку. Если эти предположения все же подтвердятся, вы останетесь в Беларуси или уедете работать в Москву, где родились?

— А почему вы решили, что я уеду в Москву?

— Если не ошибаюсь, вы там родились.

— А-а-а... Люди рождаются в разных местах, но это еще не повод, чтобы там оставаться на всю жизнь. Нет, у меня нет планов переехать в Москву. Я уже, слава Богу, в Беларуси с 1963 года — практически всю свою сознательную жизнь. И у меня нет необходимости куда-либо уезжать из нашей страны.

— Скажите, в связи с экономическим и финансовым кризисом увеличился ли ваш рабочий день?

— Вы знаете, у меня рабочий день с 8 утра и до 21 часа вечера. Поэтому я бы не стал говорить, что он заметно возрос. Но, наверное, в выходные стал больше работать...

— На днях глава государства сказал: *"Я хочу, чтобы вы одевались в свое и или свое. Может, оно хуже упаковано, чем импортное, но сегодня ситуация такая, что валюты не хватает"*. Расскажите и покажите, одежда каких марок на вас сейчас надета?

— На мне рубашка "Элиз". Костюм пошит в ателье напротив здания МВД, нашими работниками.

— Часы?

— Часы не "Луч", к сожалению...

— А туфли?

— Не помню. Честно говорю, что не помню... А вот во всяком случае остальное — практически все белорусское.

...После завершения пресс-конференции "Народная Воля" подошла к Кобякову с просьбой взглянуть на его туфли.

— Не надо на них смотреть, их вначале надо в порядок привести, — ответил вице-премьер и быстро ушел. Его черные туфли, кстати, на самом деле были немного запыленные. И явно не "Белвест"...

ДЕТАЛИ

Пошив мужского костюма на заказ в белорусских ателье в среднем будет стоить около 400—500 тысяч белорусских рублей.

Хорошая костюмная ткань обойдется от 50 до 500 тысяч белорусских рублей за метр. На костюм уходит около трех метров.

Готовый костюм от известного белорусского производителя "Коминтерн" стоит 170—600 тысяч белорусских рублей...

За рубашку дзержинской швейной фабрики "Элиз" надо заплатить от 35 до 100 тысяч белорусских рублей.

ГЛАС НАРОДА

Учитывая, что свои простые вопросы "Народная Воля" задавала вице-премьеру не один на один, а на пресс-конференции, где присутствовало много других журналистов, ответы Кобякова тут же разлетелись по информационным агентствам и интернет-изданиям. Приводим лишь некоторые отклики на слова Кобякова "Народной Воле" с форума на портале tut.by.

"И что можно на работе столько времени делать — с 8 до 21?"

"Западные политики столько не работают, а народ живет почему-то лучше..."

"Результатом такого изнурительного труда должны быть иные экономические показатели. А если он свой труд организовать не может, то о чем можно говорить?.."

"Дело в том, что во многих белорусских министерствах и госкомитетах есть такая "прогибацкая" мода — тупо торчать на работе, пока министр не свалит, а министр сидит (типа пашет аки бурлак на Волге) пока, допустим, в Совмине вице-премьер не уйдет домой или какой-нибудь замглавы Администрации не угомонится... Так и сидят "по цепочке" — "работают". Кстати, приход на работу на час раньше, уход в 21—22 часа и выходы на працу в выходные говорит не столько о "сложности текущего кризисно-мирового момента", а о том, что: сам руководитель не умеет работать и не может успеть сделать все в течение рабочего дня; не умеет руководить, ставить адекватные задачи своим подчиненным, планировать и т.д.

"Думаю, вполне возможно ожидать отставки правительства, тем более если послушать, как Сидорский на недавнем заседании Совмина уговаривал совершить чудо..."

Марина КОКТЫШ.

ГІСТАРЫЧНЫ ВІЗІТ

Нашчадкі Радзівілаў дагэтуль лічаць сябе грамадзянамі Вялікага Княства Літоўскага

Прадстаўнікі славутага роду Радзівілаў упершыню за доўгія гады наведалі Беларусь. Цягам трох дзён яны вандравалі па нашай краіне.

У Беларусь прыехала 91-гадовая Альжбета Радзівіл — дачка апошняга гаспадара Нясвіжскага замка Альбрэхта Радзівіла, яе сын Аба, двое ўнукаў і ашчэ шасцёра нашчадкаў Радзівілаў. Гэта быў прыватны візіт прадстаўнікоў вядомага магнацкага роду. З ініцыятывай аб запрашэнні Радзівілаў у Беларусь выступіў малады беларускі журналіст Глеб Лабадзенка. Яго падтрымала і амбасада Рэспублікі Польшча ў Беларусі.

Прыляцеўшы ў Мінск, Радзівілы размясціліся ў гатэлі "Беларусь", адкуль на мікраўтобусе адправіліся ў Чырвоны касцёл на імшу. Адтуль — у сталічную краму "Радзівілаўскую", дзе госці былі прыемна ўражаны асартыментам прадукцыі.

Далей быў візіт у мястэчкі Іўкальдзь, Паланечка і Мір. Пра свае ўражанні ад убачанага ў Міры з намі падзяліўся князь Мацей Радзівіл:

— Я моцна ўражаны пабачаным у Міры, бо быў тут дваццаць гадоў таму. Тады гэта ўсё выглядала вельмі кепска. Быў знішчаны могільнік, сам замак быў малаадбудаваны, а цяпер бачу, што касцёл і царква адбудаваныя. Гэта вельмі радуе. Пазнаёміліся мы ў Міры і з некалькімі асобамі, якія вельмі цікавяцца культурай, традыцыямі і хочуць нешта ведаць пра мінулае...

У другі дзень свайго прабывання ў Беларусі нашчадкі Радзівілаў наведалі шэраг сталічных музеяў і Нацыянальную бібліятэку Беларусі. Там прадстаўнікі славутага роду пакінулі кнігу, дзе было змешчана іх генеалагічнае дрэва. Гэтым падарункам былі забітыя адразу два зайцы: па-першае, падарункам папоўніўся бібліятэчны фонд, а па-другое, гэтая кніга павінна абаранiць Беларусь ад людзей, якія выдаюць сябе за нашчадкаў Радзівілаў, хаця самі да іх ніякага дачынення не маюць. Такія выпадкі, гаворыць, былі... Далей у насычанай праграме знаходжання Радзівілаў у Беларусі быў запланаваны візіт у Музей беларускай гісторыі і культуры.

...Было па ўсім відаць, што супрацоўнікі музея хвяляваліся. Першай у музей увайшла Альжбета Радзівіл. Узняўшыся на другі паверх, яна агледзела генеалагічнае дрэва Радзівілаў і затым спынілася ля партрэта сваёй бабулі — Марыі Ружы Браніцкай. Праз некалькі імгненняў Альжбета Радзівіл вымавіла: "У гэтым музеі самая дзённая карціна маёй бабулі, якая б толькі магла быць... Марыя Ружа Браніцкая ў жыцці была значна прыгажэйшай", — адзначыла яна. Супрацоўнікі музея спрабавалі апраўдвацца, але ў іх гэта не вельмі атрымалася. Пасля заканчэння экскурсіі Альжбета Радзівіл адзначыла, што самі супрацоўнікі Музея гісторыі і культуры падчас іх візіту даведаліся значна больш пра іх род, чым ведалі дагэтуль...

У апошні дзень трохдзённага візіту Радзівілы наведалі Нясвіжскі замак. У Радзівілаў існуе традыцыя: кожны прадстаўнік роду незалежна ад лініі павінен хоць раз пабываць у Нясвіжы. Дарэчы, Альжбета Радзівіл добра памятае гэты замак яшчэ з маленства. Яна часта бывала тут у свайго бацькі на летніх канікулах. Апошнім разам Альжбета Радзівіл была ў Нясвіжы ў 1935 годзе — у год смерці свайго бацькі. *"Я і дагэтуль добра памятаю тут кожны куток, бо гэта ж быў мой дом. Помню, як у маленстве я бегала на кухню, мяне вельмі цікавіў працэс прыгатавання ежы. Повар-паляк не дазваляў мне нічога там рабіць, а сам гатаваў проста фантастычна.*

Яшчэ помню, што вольны час я бавіла за верхавой яздой. У нас, акрамя коней для карэт, былі дзве ездавыя..."

Падчас заканчэння прабывання ў Беларусі князь Мацей Радзівіл прызнаўся карэспандэнту "Народнай Волі", што многія нашчадкі гэтага славутага роду дагэтуль лічаць сябе грамадзянамі Вялікага Княства Літоўскага:

— Разумееце, зусім не важна, хто я па пашпарце — паляк, літовец ці беларус. Галоўнае, што ў сэрцы я адчуваю сябе грамадзянінам Вялікага Княства Літоўскага. Справа ў тым, што ВКЛ было вельмі добрай дзяржавай, там жылі ўсе разам: пратэстанты, яўрэі, католікі... Тая дзяржава, канечне, сёння не магла б стаць узорам для іншых краін. Але 300—500 гадоў таму яна была вельмі талерантнай для ўсіх... Цэнтр ВКЛ — гэта, безумоўна, Беларусь. Мне падаецца, што сэрца Княства тут б'ецца ў кожным чалавеку. Можа быць, людзі мараць эміграваць у тую легендарную і моцную краіну".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Беларускіх спецыялістаў чакаюць у Еўропе з «блакітнай картай»

Атрымаўшы яе, беларусы змогуць значна прасцей уладкавацца на працу ў Еўрасаюзе і атрымаць сацыяльныя гарантыі. А іх сем'ям дазволяць свабодна наведваць "кармільцаў".

25 мая Еўракамісія прыняла дырэктыву аб увядзенні так званай "блакітнай карты". Яна павінна палегчыць легальнае працаўладкаванне ў краінах Еўрасаюза працаўнікам з іншых краін, у тым ліку і з Беларусі.

"Блакітная карта" будзе дзейнічаць ад 1 да 4 гадоў у залежнасці ад краіны, кажуць у прэсслужбе Еўрапейскага савета: *"Гэта залежыць ад краіны, яны будуць вырашаць гэта кожная самастойна,* — тлумачыць супрацоўнік прэс-службы Еўрапейскага савета ў інтэрв'ю "Еўрарадыё". — *Адна краіна вырашыць зрабіць карту на 1 год, а іншая на 4. У кожным выпадку будзе магчымасць, каб яе працягнуць".*

А вось працэдуры атрымання "блакітнай карты" будуць аднолькавыя для ўсіх краін Еўрасупольнасці. Толькі спачатку ім трэба прыняць гэты закон, на што Еўракамісія вызначыла 2 гады. Некаторыя краіны могуць прыняць змены хутчэй, аднак атрымаць "блакітную карту" можна будзе не раней чым у 2011 годзе.

Сусветны банк можа выдзеліць крэдыт

Памер дапамогі не менш як 200 мільёнаў долараў, і пойдзе ён на "на мэты развіцця"

Аб гэтым паведаміў на прэс-канферэнцыі ў Мінску віцэ-прэм'ер **Андрэй Кабякоў**. *"Матрыца сумесных мер па атрыманні пазык на мэты развіцця ў добрым стане. Цяпер мы займаемся яе шліфоўкай",* — сказаў ён.

Віцэ-прэм'ер таксама нагадаў, што ў стадыі абмеркавання знаходзіцца пытанне аб атрыманні ад Сусветнага банка крэдыту ў памеры 125 млн долараў на аптымізацыю энергетычнай сістэмы. Што да атрымання другога траншу крэдыту ад Міжнароднага валютнага фонду, то, як зазначыў Кабякоў, *"Беларусь не губляе аптымізму"*. Ён разлічвае, што ў хуткім часе будзе дасягнута станоўчае рашэнне па гэтым пытанні.

КАЛОНКА АЛЕСЯ НЯЎВЕСЯ

«Нешта»

"Сярэдні заробак у працаўнікоў навукі склаў 1.607.000 рублёў - амаль у паўтара раза больш, чым у будаўнікоў, сувязістаў, чыгуначнікаў... Між тым агульны кошт дамоў па экспарце інтэлектуальнага прадукту Акадэміі навук склаў 5,4 мільёна долараў ЗША. І гэта ўсё, што запатрабавана за межамі нашай краіны і чым зацікавілі беларускія вучоныя? Не густа, улічваючы, што ў Акадэміі сёння працуе больш за 16.000 чалавек, у тым ліку 510 дактароў і 2000 кандыдатаў навук".

"Снплюс"

Наш Хведзя
Быў з дзяцінства не дурны!
Стаў доктарам навук
Увішны Хведзя!
Працёр за кнігай не адны штаны
І не адзін мазоль сабе адседзеў.
Не быў ні ў кога, як у горле косць,
Нікому ён не перабег дарогу,
Пасада, званне, шанаванне ёсць,
Заробак неблагі —
І слава Богу!
Ніхто не чуў пра навуковы плён,
Ніхто не ведаў пра яго адкрыцці.
Хіба ў навуцы
Гэткі толькі ён?
Такіх "ніякіх"
Сотні "пры карыце".
І так бы праляцела ўсё жыццё —
Бязвоблачна, заможна, роўна-гладка,
